и методично переплетаются с программным материалом. Развивающие задания и игры творческого характера дают общую зарядку мыслительным процессам, мотивируют ребёнка к учебному предмету [4, с.67].

Опираясь на результаты диагностики и личные наблюдения, я могу сказать, что использование на уроках литературного чтения творческих заданий и игр повысило читательский интерес у учащихся. Создание творческой атмосферы и включение в творческую деятельность способствовало обогащению внутреннего мира учащихся, повысило их активность, самооценку, открыло возможность для самореализации каждого ребенка.

**Список использованных источников:**

1. Загурская, Е. Л. Использование активных форм и методов обучения в работе с младшими школьниками / Е. Л. Загурская. – Мозырь, 2006. – С. 12–24.
2. Оморокова, М. И. Совершенствование чтения младших школьников. Методическое пособие для учителей / М. И. Оморокова. – М. : АРКТИ. –2000. – 160 с.
3. Тумова, З. В. Формирование читательского интереса у младших школьников / З. В. Тумова // Наука и современность. – 2014. – № 30. – С. 87.
4. Фопель, К. Как научить детей сотрудничать? Психологические игры и упражнения : практическое пособие / К.Фопель – М., 2000. – С. 67.

## МАГЧЫМАСЦІ НАСТАЎНІКА-ФІЛОЛАГА ВА ЎКАРАНЕННІ ПРЫНЦЫПАЎ АДУКАЦЫІ Ў ІНТАРЭСАХ УСТОЙЛІВАГА РАЗВІЦЦЯ

*Захарчук І.У.,*
*ДУА «Сярэдняя школа № 2 г.Слоніма»,*
*г. Слоніма, Рэспубліка Беларусь*

**Анатацыя.** Інфарміраванне пра прынцыпы ўстойлівага развіцця і інтэграцыя гэтых прынцыпаў ажыццяўляецца паўсюдна. Настаўнікі школы маюць магчымасць для рэалізацыі ініцыятывы па ўкараненні ключавых прынцыпаў устойлівага развіцця ў вучэбны працэс. Разглядаецца дзейнасць настаўніка-філолага па ўкараненні прынцыпаў адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця.

**Resume.** Information on the principles of sustainable development and integration of these principles is carried out everywhere. Teachers of the school have the opportunity to implement the initiative to implement the key principles of sustainable development in the educational process. The activity of a teacher of philology on the introduction of the principles of education in the interests of sustainable development is considered.

**Ключавыя словы:** адукацыя, мэты ўстойлівага развіцця, ключавыя прынцыпы, складнікі, прыёмы; education, goals of sustainable development, key principles, components, techniques.

**Key words:** education, goals of sustainable development, key principles, components, techniques; education, goals of sustainable development, key principles, components, techniques.

25 верасня 2015 г. на гістарычным саміце Арганізацыі Аб'яднаных Нацый дзяржавы члены ААН прынялі Парадак дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года, у якім замацавалі 17 Мэт устойлівага развіцця (МУР). Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка, змацаваўшы сваім подпісам гэты гістарычны дакумент, пацвердзіў імкненне Беларусі дасягнуць гэтых мэт.

МУР 4 – гэта забеспячэнне ўсёахопнай і справядлівай якаснай адукацыі і заахвочванне магчымасці навучання на працягу ўсяго жыцця для ўсіх. Адукацыя з'яўляецца ключавым элементам, які дазволіць дасягнуць многіх іншых мэт устойлівага развіцця. Адукацыя спрыяе скарачэнню няроўнасці і дасягненню гендэрнай роўнасці, пашырае магчымасці для людзей ва ўсім свеце жыць больш здаровым і стабільным жыццём. Яна таксама пашырае магчымасці для людзей ва ўсім свеце жыць больш здаровым і стабільным жыццём. Адукацыя таксама іграе важную ролю ў павышэнні талерантнасці ў адносінах паміж людзьмі і спрыяе фарміраванню больш мірных таварыстваў. У падпункце 4.7. акрэслена «Да 2030 года забяспечыць, каб усе навучэнцы набывалі веды і навыкі, неабходныя для садзеяння ўстойліваму развіццю, у тым ліку праз навучанне па пытаннях устойлівага развіцця і ўстойлівага ладу жыцця, правоў чалавека, гендэрнай роўнасці, прапаганды культуры міру і не гвалту, грамадзянства міру і ўсведамлення, каштоўнасці культурнай разнастайнасці і ўкладу культуры ва ўстойлівае развіццё». Адукацыя разглядаецца ў якасці працэсу, які доўжыцца ўсё жыццё, які неабходны не толькі «карэктаваць, але і змяняць і пераўтвараць», ці іншымі словамі, ад адукацыі «на ўсё жыццё» неабходна перайсці да адукацыі «праз усё жыццё».

У Стратэгіі АУР (адукацыі ўстойлівага развіцця) запісана, што «для таго, каб быць эфектыўнай, АУР павінна разглядацца ў двух аспектах:

1) праз інтэграцыю тэм АУР ва ўсе адпаведныя навучальныя дысцыпліны, праграмы і курсы;
2) праз арганізацыю заняткаў па канкрэтных тэматычных праграмах і курсах.

Неабходна надаваць асаблівую ўвагу пазітыўнаму вопыту навучання, які спрыяе фарміраванню ўстойлівых паводзін, у прыватнасці ў адукацыйных установах, на працоўных месцах, у сям’і, у грамадстве; умацоўваць супрацоўніцтва і партнёрства паміж педагагічнай грамадскасцю і іншымі зацікаўленымі бакамі.

Наладжванне цесных сувязей паміж навучальным працэсам і жыццём грамадства дасць магчымасць навучэнцам:

- набываць дадатковы практычны вопыт;
- садзейнічаць разуменню сутнасці глабальных, рэгіянальных, нацыянальных і мясцовых экалагічных праблем шляхам тлумачэння жыццёвага цыклу і надання асноўнай увагі не толькі ўздзеянню на навакольнае асяроддзе, але і сацыяльна-эканамічным наступствам, разглядаючы як прыроднае, так і антрапагенна змененае навакольнае асяроддзе;
- прымяняць шырокі дыяпазон метадаў навучання, і ў прыватнасці, актыўных метадаў, метадаў, арыентаваных на канкрэтныя працэсы і знаходжанне рашэнняў, адаптаваных да патрэб вучняў.

Акрамя традыцыйных метадаў варта, у прыватнасці, выкарыстоўваць дыскусіі, стварэнне канцэптуальных карт і карт успрымання, філасофскае асэнсаванне свету, растлумачэнне каштоўнасных катэгорый, ролевыя і імітацыйныя гульні, падрыхтоўку сцэнарыяў развіцця, мадэляванне, гульні, інфармацыйна-камунікацыйныя. тэхналогіі (ІКТ), абследаванні, тэматычныя даследаванні, экскурсіі і пазакласнае навучанне, падрыхтоўка праектаў, якія выконваюцца вучнямі, аналіз перадавога вопыту, вывучэнне вопыту, набытага на вытворчасці, падмацоўвацца адпаведнымі вучэбнымі матэрыяламі, такімі, як метадалагічныя, педагагічныя і дыдактычныя выданні, падручнікі, наглядныя дапаможнікі, брашуры, тэматычныя даследаванні і прыклады перадавога вопыту, электронныя, аўдыё- і відэародкі» [1].

Такім чынам, АУР уяўляе сабой, з аднаго боку, міжпрадметную вобласць ведаў, якая ўключае прыродазнаўчыя, сацыяльныя і эканамічныя дысцыпліны, сістэмныя навукі; з другога боку, уключае ў сябе працэс навучання, выхавання, самаразвіцця, самарэалізацыі, арыентаваныя на фарміраванне крытычна думаючых, духоўна багатых і сацыяльна актыўных грамадзян, якія будуць засноўваць свае практычныя дзеянні на прынцыпах

экалагічнай этыкі, праяўляць клопат аб захаванні гарманічнага стану прыроднага асяроддзя, імкнуцца да атрымання ведаў аб навакольным асяроддзі і садзейнічаць рашэнню існуючых і папярэджанню новых сацыяльных, эканамічных і экалагічных праблем [2].

Як настаўнік-практык, выкладчык беларускай мовы і літаратуры, настаўнік, што выконвае функцыі класнага кіраўніка (6 клас), я разумею, што павінна забяспечыць уключэнне пытанняў устойлівага развіцця ў школьны адукацыйны працэс, павышаць дасведчанасць вучняў у галіне ўстойлівага развіцця. У педагагічнай дзейнасці прытрымліваюся наступных прынцыпаў: вучыцца на працягу ўсяго жыцця; вучыць дзяцей быць добрымі; дапамагаць вучням у вучэбнай дзейнасці. Па магчымасці рэалізую ў дзейнасці асноўныя прынцыпы ўстойлівага развіцця. Да іх адносяцца:

1. Прыродаахоўны імператыў (безумоўны арыенцір на не перавышэнне гранічна дапушчальных узроўняў антрапагеннага ўздзеяння на экасістэмы).
2. Сістэмнасць (комплексны погляд на праблему, выпрацоўка планаў дзеянняў і іх рэалізацыя з улікам эканамічнага, экалагічнага і сацыяльнага складнікаў).
3. Мэтавая арыентацыя (выпрацоўка мэтавай устаноўкі і адпаведная пабудова планаў і дзеянняў з арыентацыяй на дадзеную мэту).
4. Працэс (разуменне стратэгіі ўстойлівага развіцця як працэсу актыўных доўгатэрміновых дзеянняў, а не проста распрацоўка дакумента з такой назвай).
5. Эфектыўнае выкарыстанне (эканомія) рэсурсаў.
6. Партнёрства (сумесная праца ўсіх удзельнікаў працэсу ўстойлівага развіцця, у тым ліку педагогаў і навучэнцаў, прадстаўнікоў дзяржаўных і мясцовых органаў улады, бізнесу, грамадскіх арганізацый, навуковай супольнасці).
7. Роўнасць пакаленняў (паляпшэнне якасці чалавечага жыцця для цяперашняга і будучага пакаленняў).
8. Арыентацыя на выкарыстанне мясцовых рэсурсаў пры адначасовым уліку інавацыйных падыходаў і тэхналогій.
9. Адкрытасць і празрыстасць планаў і дзеянняў у рамках працэсу ўстойлівага развіцця.
10. Выкарыстанне індыкатараў устойлівага развіцця. Арыентацыя на дадзеныя прынцыпы можа аказаць істотную дапамогу настаўніку любога прадмета пры «насычэнні» яго элементамі светапогляду ўстойлівага развіцця [3].

Зразумела, трэба мець базавыя веды па пытаннях устойлівага развіцця, у гэтым дапамагае самаадукацыя. Для эфектыўнага ўкаранення прынцыпаў устойлівага развіцця выкладчыкі павінны супрацоўнічаць адзін з адным: яны павінны паказваць вучням магчымасць сістэмных рашэнняў, а не абмяжоўваць матэрыял урокаў выключна сваім прадметам. У сваёй дзейнасці цесна супрацоўнічаю з настаўнікамі гісторыі і грамадазнаўства, геаграфіі, біялогіі, мастацтва (сусветнай і айчыннай культуры). Для мяне спачатку было складана ўключаць асноўныя тэмы ўстойлівага развіцця ў вучэбную праграму, змест урока, не заўсёды ведала, як гэта зрабіць. Паспрабавала вызначыць найбольш важныя тэмы канцэпцыі ўстойлівага развіцця, эфектыўна ўводзіць іх у змест урокаў і зацікавіць вучняў падчас заняткаў. Змест адукацыйных праграм «Беларуская мова» «Беларуская літаратура» ў значнай ступені вызначае, наколькі добра навучэнцы будуць дасведчаныя аб патрэбах сучаснага свету.

Якім пытанням ўдзяляю ўвагу на ўроках і пазакласных мерапрыемствах? Гэта этычныя каштоўнасці, адказнае спажыванне, справядлівы гандаль, грамадзянскае грамадства, устойлівая эканоміка, ахова навакольнага асяроддзя, змяненні клімату і прадухіленне стыхійных бедстваў, рацыянальнае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, гендэрная роўнасць, правы дзяцей, адказнае выкарыстанне СМІ. Маюць месца пытанні, якія тычацца непасрэдна прадметаў: мульцікультуралізм, канцэпцыя «малой радзімы», нацыянальная спадчына, нацыянальная разнастайнасць, унікальнасць беларускага мастацтва ў сусветным кантэксце, глабалізацыя, масавая культура, жанчыны ў культуры, жанчыны як дзеячы мастацтва і г. д.

Арганізую знаёмства вучняў з лагатыпамі мэтаў устойлівага развіцця. Абапіраюся на палажэнні Хартыі Зямлі. Выкарыстоўваю іх як механізм для ўключэння этычна-маральнага кампанента ў вучэбныя праграмы, з дапамогай якога можна палепшыць якасць адукацыі; паняцце «якасная адукацыя» заснавана на 4-х базавых прынцыпах руху: «Адукацыя для ўсіх і кожнага», «Вучыцца ведам», «Вучыцца працы», «Вучыцца жыць разам і ў грамадстве іншых людзей, вучыцца быць». Асабліваe значэнне тут набывае прынцып 2 Хартыі Зямлі, які заклікае да педагогікі любові і клопату: «Клапаціцца аб усім з разуменнем, любоўю і спагадай».

З вучнямі наладжваюцца дэбаты «Якасная адукацыя: чаму гэта важна?». Уключаюцца пытанні «Дзе людзям складаней за ўсё атрымаць доступ да адукацыі?», «Што мы можам зрабіць?» Разам з настаўнікам геаграфіі распрацоўвалася вучнямі насценная карта, якая ілюструе магчымыя наступствы змены клімату для прыроды і чалавецтва ў розных частках свету да канца 21-га стагоддзя; стварэнне экасцежкі ў Альбярціне (прагулачна-пазнавальнага маршруту па адным са слонімскіх паркаў). Параўнанне з экасцежкай ў Валожынскім раёне, на ўскрайку Налібоцкай пушчы. Распрацоўка вучнямі настольных гульняў на экалагічныя праблемы, па нацыянальных скарбах і славутасцях, выкарыстоўваючы мясцовыя малюнкі на гульнёвым полі. Шматлікія абрады, спевы, рамёствы, атрыманыя ад продкаў і старанна захаваныя, адрозніваюць нас ад іншых нацый, гэта ўсведамляецца вучнямі. Маюць месца шматлікія формы работы. Напрыклад, правядзенне з вучнямі квесту «Калі важна эрудзіраваным быць табе», гульні-спаборніцтва «Таямніцы вясковай хаты», выпуск буклета «Мы выбіраем будучыню», аналіз чэленджа «170 паўсядзённых спраў, якія дапамогуць зрабіць свет лепшым», складанне ўласнага чэленджа вучнямі «Карысныя справы дзяцей для ўстойлівага развіцця».

Вялікім патэнцыялам для прывіцця вучням каштоўнасцяў светапогляду ўстойлівага развіцця валодаюць гульнёвыя прыёмы для развіцця творчага мыслення, падчас прымянення якіх ажыццяўляецца маўленчая дзейнасць: «Невядомы малюнак», «Чараўнікі», «Танец», «Пра што музыка распавяла», «Што гэта?», «Каменьчыкі на беразе», «Што раскажуць воблакі», «Што чуецца мне ў шуме сосен», «Калі зазірнеш у расінку», «Цішыня, якая гаворыць», «Невядомы дождж» і пад. Мэта выкарыстаных прыёмаў: навучыць на аснове ўспрымання прадметаў, з’яў ствараць новыя вобразы ва ўяўленні і іх славесна апісваць. Насычэнне вучэбнага матэрыялу па розных прадметах ілюстрацыйнай «абалонкай», якая адлюстроўвае прынцыпы ўстойлівага развіцця, дазваляе фарміраваць светапогляд ўстойлівага развіцця ў навучэнца як бы паралельна з рашэннем задач прадметных курсаў. Выкарыстоўваю прыёмы работы з асацыятыўнымі карткамі «Я і ўсё-ўсё», «Жыццё як цуд», «Мой верны шлях», «Сямейны альбом» і пад. Прыёмы з асацыятыўнымі карткамі «Аптымістычныя цытаты», «Незнаёмыя знаёмыя афарызмы» «Мудрасць ночы», «Ранішняе натхненне», «Суаднесенасць з выказваннем» садзейнічаюць як развіццю творчасці і маўлення, так і станаўленню культуралагічнай кампетэнцыі, бо прапаноўваюцца афарызмы і беларускіх, і рускіх, і замежных аўтараў, называюцца сусветна вядомыя творы. Праз урокі ствараюцца ўмовы для раскрыцця прыродных задаткаў навучэнцаў, актывізацыі і развіцця іх творчага патэнцыялу і духоўнага ўдасканалення.

У працы арыентуюся на сацыялізацыю асобы, падрыхтоўку яе да жыцця ва ўмовах дынамічна зmяняльных сацыяльна-эканамічных адносін. Пры гэтым асноўны акцэнт рабіцца на стварэнне аптымальных умоў для асобасна арыентаванай адукацыі, дыферэнцыяцыі і індывідуалізацыі адукацыйнага працэсу, на развіццё творчага патэнцыялу кожнага вучня, падрыхтоўку яго да жыцця ва ўмовах навукова-тэхнічнага прагрэсу. Ствараю для сваіх вучняў індывідуальныя праграмы развіцця, задача якіх—стварэнне такой адукацыйнай прасторы, якая дазваляе забяспечыць асобасны рост вучня і яго падрыхтоўку да паўнавартаснага і эфектыўнага ўдзелу ў грамадскім і прафесійным жыцці як канкурэнтназдольнай, паспяховай асобы на аснове развіцця даследчай, сацыяльнай і камунікатыўнай кампетэнтнасці. Распрацоўваю і ўкараняю ў адукацыйны працэс вучэбна-метадычнае суправаджэнне даследчай і творчай дзейнасці вучня праз індывідуалізацыю

(цьютарскае суправаджэнне), падчас якога абдываецца стварэнне аптымальных умоў для паўнавартаснага індывідуальнага развіцця кожнага вучня з улікам яго псіхічных асаблівасцяў, інтэлектуальных і творчых здольнасцяў.

Удзел педагогаў і вучняў у праектнай дзейнасці неабходна разглядаць як важны складнік АУР. Апошні арганізаваны праект называўся «Песня застаецца з чалавекам». Распрацоўка дадзенага праекта дала магчымасць далучыць вучняў да фальклорнай спадчыны і яе набыткаў, выхоўваць павагу і гонар да роднай зямлі, умення бачыць песенныя традыцыі вакол сябе, садзейнічала даследча-пошукавай дзейнасці, спрыяла творчаму падыходу ў вырашэнні задач: павышэнне камунікатыўнай культуры, даследчай культуры, усталяванне сяброўскіх канструктыўных і прадуктыўных ўзаемаадносін паміж суб'ектамі даследчага праекта, праява талерантнасці, увагі і цікавасці да творчасці аднагодкаў і іншых людзей.

Праца па рэалізацыі ідэй адукацыі ў інтарэсах устойлівага развіцця працягваецца і далей.

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

1. Национальная стратегия устойчивого развития Республики Беларусь на период до 2020 г. / Национальная комиссия по устойчивому развитию Респ. Беларусь ; редеолегия: Я. М. Александрович [и др.]. – Минск : Юнипак, 2004. – 200 с.

2. Петкетч, Т. В. О некоторых направлениях реализации принципов устойчивого развития на муниципальном уровне / Т. В. Петкетч // Междунар. науч.-практ. конф. по устойчивому развитию, Минск, 27–28 мая 2004 г. : тез. докл. – Минск : Юиипак, 2004. – С. 254–259.

3. Образование в интересах устойчивого развития : информационно- аналитический обзор / Т. Н. Ковалева [и др.]. – Минск : МГЭУ им А. Д. Сахарова, 2007. – 103 с.

# ПОПУЛЯРИЗАЦИЯ ИСТОРИКО-КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ ПОСРЕДСТВОМ ЛИНГВОДИДАКТИЧЕСКИХ МАТЕРИАЛОВ ПО РУССКОМУ ЯЗЫКУ КАК ИНОСТРАННОМУ

*Короткевич И.И.,*
*Белорусский государственный университет,*
*г. Минск, Республика Беларусь*

**Аннотация.** Обращение к национальным архитектурным памятникам имеет большой лингвометодический потенциал при обучении русскому языку как иностранному. Интерес иностранных обучающихся к объектам национальной культуры и архитектуры способствует их интеграции в глобальный культурный фонд и соответствует основным направлениям современного образования.

**Resume.** The appeal to national architectural monuments has a great linguistic and methodological potential when teaching Russian as a foreign language. The interest of foreign students in national cultural objects contributes to their integration into international culture and corresponds to the main directions of modern education.

**Ключевые слова:** архитектура, лингвометодика, русский язык как иностранный.

**Key words:** architecture, linguistic methodology, Russian as a foreign language.

В государственных долгосрочных стратегиях, определяющих цели, этапы и направления развития государств, в т. ч. и Республики Беларусь, к повышению качества жизни их граждан, образование занимает немаловажную позицию. Стандарты и